✓З 12 кастрычніка ў Гудзевіцкім дзяржаўным літаратурна-краязнаўчым музеі працуе выстава работ мясцовых жанчын-майстрых «Святло матулінай душы». На ёй экспануюцца творы мастацтва як з фондаў музея, так і ад прыватных асоб. Выкананыя яны разнастайнай тэхнікай дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва: вышыўка, ткацтва, вязанне кручком, салома-, лозапляценне і іншае.

Выстава працуе па 9 лістапада.




✓18 кастрычніка ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь пачаў працу выставачны праект 1000 рарытэтаў Беларусі «Я Вам пішу…». На экспазіцыі прадстаўлены ўнікальныя старадаўнія лісты і паштоўкі, якія можна пачытаць і ўзяць у рукі, мэбля і пісьмовыя прылады розных эпох. Усе прадметы прадстаўляюць розныя рэгіёны. Таксама экспануецца багаты асартымент канцылярскай прадукцыі айчынных і замежных вытворцаў беларускіх магазінаў канца XIX – пачатку XX ст. Наведвальнікі выставы пабываюць і ў паштовым аддзяленні савецкіх гадоў – стылізаванай пад 1950 – 1960-я гады зале Мінскага галоўпаштамта.

Выстава працягне працу па 31 студзеня 2024 года.

✓18 кастрычніка ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» адкрылася выстава «Гасцінец», прымеркаваная да трыццацігоддзя камісіі «Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва і дызайн» Мінскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў. Наведвальнікі выставы ўбачаць больш за сто пяцьдзясят творчых работ навучэнцаў другога, трэцяга і чацвёртага курсаў, а таксама дыпломныя працы выпускнікоў апошніх гадоў спецыяльнасцей «Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва» (кераміка, саломапляценне, аплікацыя саломкай, разьба па дрэве). Аснова творчасці – вобразы гісторыі Беларусі, народных святаў, нацыянальныя прыродныя каштоўнасці.




На выставе прадстаўлены працы ў тэхніцы саломапляцення. Сярод іх асаблівае месца займаюць аклады абразоў у тэхніцы аб'ёмнага і прамога пляцення. Таксама ў экспазіцыі прадстаўлены творы з керамікі. Асноўная тэхніка – ручная фармоўка, але ёсць творы, зробленыя на ганчарным коле. Працы дэкарыраваны ангобамі, палівамі. Прыцягваюць увагу працы па апрацоўцы дрэва ў розных тэхніках выканання: ажурна-рэльефная разьба (шкатулкі), рэльефная разьба (дэкаратыўныя рамы для люстэркаў), аб'ёмна-скульптурная разьба (выявы птушак, жывёл, людзей).

✓З 19 кастрычніка ў Музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі працуе выстава «Кніжныя скарбы Куцеінскага манастыра», прымеркаваная да 400-годдзя з дня заснавання Куцеінскага Богаяўленскага манастыра, аднаго з самых старажытных праваслаўных манастыроў нашай краіны. У 1623 г. Багдан Статкевіч надаў фундуш на будаўніцтва праваслаўнага манастыра Богаяўлення каля Оршы. Куцеінская друкарня працавала пры манастыры ў 1630 – 1654 гг. У манастырскай друкарні выдавалася навукова-асветніцкая, царкоўна-палемічная і свецкая літаратура на царкоўнаславянскай і старабеларускай мовах. Яе выданні вылучаліся своеасаблівым графічным афармленнем.

Выстава знаёміць са старонкамі гісторыі манастыра, а таксама з выданнямі манастырскай друкарні і кнігамі з манастырскай бібліятэкі. Са збораў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі экспануюцца рукапісны помнік – Сінодзік Куцеінскага манастыра XVIII ст., узор перакладной літаратуры «Казанне пра Варлаама і Іасафа» (1637), «Брашна духоўнае» (1639), «Актоіх» Іаана Дамаскіна (1646), Новы Запавет з Псалтыром (1652), адно з прыгажэйшых богаслужэбных выданняў «Трыфалагіён» (1647) і «Лексікон…» Памвы Бярынды (1653). Таксама ўвазе зацікаўленых прадстаўлены шэраг кірылічных выданняў і рукапісаў XVII – XVIII стст. з запісамі Куцеінскага манастыра. Сярод іх рукапісны нотны Ірмалогій XVII ст., еўеўскае выданне Евангелля вучыцельнага 1616 г., маскоўскія і кіеўскія богаслужэбныя старадрукі.

Выстава будзе працаваць да 30 лістапада.

✓20 кастрычніка ў Мастацкай галерэі Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка адкрылася выстава графікі Ізраіля Басава «Паэзія ў лініях». Ізраіль Басаў – беларускі мастак, які з'яўляецца адным з самых




яркіх прадстаўнікоў беларускага савецкага андэграўнду. Ён працаваў у станковым жывапісе ў жанрах пейзажа і партрэта, а таксама ў графіцы (туш, фламастар, сангіна, аловак). На выставе раскрываецца ўся своеасаблівасць графікі Ізраіля Басава.

Выстава экспануецца да 19 лістапада.

✓З 21 кастрычніка ў Музеі гісторыі Гарадніцы экспануецца выстава «Падвойныя дываны», прымеркаваная да 110-годдзя з дня нараджэння адной з вядомых у Беларусі ткачых




Ядвігі Аўгустаўны Райскай з вёскі Адэльск Гродзенскага раёна.

У другой палове XIX ст. падвойныя дываны, як вырабы рамесніцкага ткацтва, з'яўляюцца на Гродзеншчыне. Падвойнае ткацтва – гэта ўнікальная тэхніка традыцыйнага беларускага тэкстылю. Назва «падвойныя» вынікае з асаблівасцей ткацкай тэхналогіі, вядомай са старажытных часоў. Ткацтва дываноў патрабавала шырокіх ткацкіх станкоў, спецыяльных тэхнічных навыкаў снавання і навівання двухколернай асновы і ткання. Характэрнай адметнасцю падвойных дываноў з'яўляецца выкарыстанне толькі ваўняных нітак, двухколернай асновы і абсалютна ідэнтычны малюнак з абодвух бакоў вырабу.

Да ўвагі наведвальнікаў прадстаўлены падвойныя дываны Ядвігі Райскай, вытканыя ў 1939, 1940, 1950, 1965, 1971, 1986 гадах, якія захоўваюцца ў этнаграфічных зборах Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея.




*Скарыстаная інфармацыя Гудзевіцкага дзяржаўнага літаратурна-краязнаўчага музея, Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь, мастацкай галерэі «Універсітэт культуры», Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка, Музея гісторыі Гарадніцы.*